Метадалагічныя і метадычныя аспекты выкладання мовы і літаратуры ў школе і ВНУ: зб.навук.арт.памяці праф.В. У. Протчанкі / пад рэд. Л. А. Мурынай. – Мінск: Беларус.дзярж. ун-т, 2002. – Вып.1.
*В. У. Праскаловіч*

# РАЗВІЦЦЁ ЛІТАРАТУРНА-ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ: МЕТАДАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ

Праблема фарміравання і развіцця здольнасцей даследуецца сумеснымі намаганнямі многіх навук (псіхалогіі, педагогікі, эстэтыкі, філасофіі, сацыялогіі, медыцыны). Вывучаецца яна markeрознабакова, таму што кожная навука мае свой адпаведны аспект даследавання. У педагагічнай навуцы гэта праблема разглядаецца не ізалявана ад сістэмы навучання, а як яе састаўная частка. Акрамя таго, варта адзначыць, што для педагогікі больш, чым для іншай навукі, важна даследаванне здольнасцей кожнай асобы. Менавіта праз здольнасці асоба становіцца суб'ектам дзейнасці ў грамадстве, праз развіццё здольнасцей чалавек дасягае сваёй вяршыні ў прафесіянальным і асобасным сэнсе (грэч. *akme* – ‘вяршыня’; адсюль паходзіць назва такой навуковай дысцыпліны, як акмеалогія, што вывучае заканамернасці такога ўзыходжання і яго характарыстыкі).

Псіхолагі разглядаюць здольнасць як складаную індывідуальна-псіхічную асаблівасць чалавека, што вызначае яго прыдатнасць да той ці іншай дзейнасці. Гэта палажэнне аб узаемасувязі здольнасцей і дзейнасці стала вядучым у навуцы.

Сярод разнастайных відаў чалавечай дзейнасці вучоныя вылучаюць наступныя: камунікатыўную, або дзейнасць зносін; маўленчую; мастацкую і інш.; раскрываюцца іх узаемныя сувязі, што стымулююць актыўнасць асобы, усебаковасць яе праяўленняў.

Згодна з канцэпцыяй, распрацаванай М. С. Каганам, чалавечая дзейнасць утварае сістэмнае адзінства пяці відаў дзейнасці: пераўтваральнай, пазнавальнай, каштоўнасна-арыентацыйнай, камунікатыўнай і мастацкай. Мастацкае асваенне свету, сцвярджае вучоны, адбываецца дзякуючы арганічнаму зліццю іншых чатырох відаў дзейнасці.

Ю. Б. Бораў разглядае чалавечую дзейнасць у двух планах: як “дзейнасць суб'екта, напраўленую ва ўнутраны план”, і як “дзейнасць суб'екта, напраўленую да знешняга”. На думку В. У. Протчанкі, мастацтва ёсць “вобразная мадэль чалавечай жыццядзейнасці”, яна дубліруе абодва тыпы дзейнасці чалавека – інтэрыярызацыю і экстэрыярызацыю.

Зыходзячы з асноўнага палажэння псіхалагічнай навукі аб тым, што здольнасці чалавека развіваюцца ў адпаведнай дзейнасці, можна сцвярджаць,

што літаратурныя здольнасці школьнікаў, а гэта значыць чытацкія (перцэптыўныя) і творчыя (пісьменніцкія), развіваюцца найперш у такім відзе дзейнасці, як чытанне.

Чытанне не толькі абуджае ў школьнікаў патрэбнасць у літаратурнай творчасці, але і развівае іх літаратурныя здольнасці.

Паводле адной з прадуктыўных канцэпцый сучаснай гуманітарнай навукі, паміж аўтарам твора мастацтва і чытачом, гледачом, слухачом няма непераходнай грані (М. Арнаудаў, М. М. Бахцін, А. М. Лявонцьеў, Б. С. Мейлах, Л. Н. Сталовіч і інш.).

Згодна з гэтай канцэпцыяй, абуджэнне і развіццё творчых мастацкіх здольнасцей у чытача, гледача, слухача ў працэсе ўспрымання ім твора мастацтва можна растлумачыць механізмам сацыяльнага наследавання. Сутнасць гэтага механізма заключаецца ў тым, што апрадмечаныя ў творах мастацтва мастацкія здольнасці іх творцаў у працэсе ўспрымання прысвойваюцца чытачамі, слухачамі, гледачамі. Вядома, каб прысваенне апрадмечаных у творах мастацтва здольнасцей творцы ажыццявілася, спажывец (рэцыпіент) мастацтва павінен ажыццявіць актыўную дзейнасць у адносінах да іх, дзейнасць, адэкватную (хаця, канешне, і не тоесную) той, якую яны ў сабе крышталізавалі.

Такім чынам, дзякуючы механізму сацыяльнага наследавання, школьнікі ў чытацкай дзейнасці прысвойваюць літаратурна-творчыя здольнасці пісьменніка, увасобленыя ў творы. Гэта прысвойванне становіцца магчымым таму, што па сваім характары працэс успрымання чытачом мастацкага твора ў многім блізкі ўласна пісьменніцкаму творчаму працэсу.

Чытач, успрымаючы не толькі мастацкі вобраз, але і аўтарскую пазіцыю, уключае ўсё, што ён стварыў, ва ўласны, але ўжо чужы для аўтара, жыццёвы кантэкст, асэнсоўвае ўласную ацэнку рэчаіснасці; значыць, работа чытача – гэта па-сапраўднаму творчая работа, але яна не тоесная аўтарскай, пры тым што ў многім ёй падобная. Па словах В. Ф. Асмуса, чытанне – гэта “праца і творчасць”, найскладанейшы творчы працэс, у якім удзельнічаюць розныя сферы псіхікі чалавека: пачуццё, уяўленне, мысленне, памяць.

Такое шматграннае і ўсебаковае разгортванне псіхічнай дзейнасці чытача надае працэсу яго чытання сатворчы характар. Чытач з развітымі перцэптыўнымі здольнасцямі не толькі ўзнаўляе многія моманты творчага працэсу пісьменніка, але, “дзякуючы свайму ўяўленню, як правіла, працягвае, дапаўняе і перайначвае ў адпаведнасці са сваім жыццёвым вопытам творчы працэс пісьменніка” [1, с.5]. У гэтым сэнсе чытача па праву можна назваць сааўтарам пісьменніка. Уплыў чытання, якое стымулюе абуджэнне літаратурна-творчай актыўнасці чытача і развіццё яго творчых (пісьменніцкіх) здольнасцей, можна растлумачыць менавіта яго сатворчым

характарам: “Чытач таксама мастак, – інакш мы не маглі б размаўляць з ім на мове вобразаў і фарбаў. Мастак-аўтар бярэ на сябе толькі частку працы. Астатняе павінен выканаць сваім уяўленнем чытач-мастак” [2, с.244].

Зусім зразумела: школа не выхоўвае спецыяльна будучых літаратараў, але праз творчую дзейнасць вучань і самасцвярджае сябе як асоба і пазнае, асвойвае мастацкі свет твора.

На сучасным этапе адукацыі ўсё больш актуалізуецца дадзеная праблема. Як слушна заўважае прафесар В. У. Протчанка, “навучанне, выхаванне і развіццё растучага чалавека – гэта магістральныя напрамкі ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі. Без паспяховага вырашэння менавіта гэтай праблемы разважанні аб рэфармаванні школы не дасягнуць жадаемых вынікаў”[3, с. 7].

### ***Літаратура***


1. *Корсунский Е. А.* Психология литературного творчества школьников. Л., 1983.
2. *Маршак С. Я.* О талантливом читателе // *Маршак С. Я.* Соч.: В 4 т. М., 1960. Т.4: Статьи и заметки о мастерстве. С. 236–269.
3. *Протчанка В. У.* Рэфармаванне адукацыі і мова // Беларуская мова і літаратура. 1997. №8.